На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб Колас

№ 100 (1165)
Аўторак, 5 чэрвеня 2001 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 100 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

Надвор'е

Сёння ўдзень па краіне захаваецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Па паўднёва-ўсходняй палавіне — дажджы, месцамі навальніцы. Па Гомельскай і Магілёўскай абласцях дажджы моцныя. Вецер паўночны, 5—10 м/с, парывы да 14. Тэмпература паветра ў Магілёве, Гомелі — +13...+15, Віцебску — +14...+16, Мінску — +15...+17, Гродне, Брэсце — +16...+18.

У наступныя двое сутак на большай частцы тэрыторыі — дажджы, навальніцы. 6-га па ўсходзе дажджы моцныя. Вецер паўночны 5—10 м/с, пры навальніцах парывы да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы — +6...+11; удзень — +12...+17, месцамі да +21.

ВЗГЛЯД

ТРОЯНСКАЯ ЛОШАДКА

В субботу, 2 июня, объявила о своем рождении еще одна "палаточная" фракция под названием "Единство". Возглавил ее никому неизвестный депутат Юрий Морозов. Знаковой же фигурой, торговой маркой очередного альянса призвана стать, судя по всему, Наталья Машерова, дочь бывшего первого секретаря ЦК КПБ Петра Машерова — белорусского аналога общесоюзной восковой куклы Леонида Брежнева. Вступив в "Единство" и продекларировав инициативу по созданию одноименной политической партии, Наталья Петровна претендует, видимо, на лавры российского парламентского блока "Единство". Только калька, как известно, всегда хуже оригинала

Александр СИЛИЧ.

Можно, конечно, приветствовать очередную политическую инициативу. Тем более в нашем самом "демократическом" государстве настоящих, громких политических инициатив — раз, два и обчелся. Только вот что-то подсказывает, что госпожа Машерова — отнюдь не инициатор и даже не режиссер политического спектакля с "Единством", а скорее актриса со стороны, которую попросили сыграть за умеренную плату заранее расписанную роль.

Об этом говорит многое. И то, что будущая партия сколачивается, судя по всему, наспех, второпях: в ее составе не предвидится ни одной мало-мальски известной личности — писателя, экономиста, юриста. На кого собираются опираться Машерова с Морозовым — непонятно. И то, что название позаимствовали у путинского "Единства", как бы намекая на то, что "Единству" белорусскому предопределен такой же триумф, а его вдохновительница въедет в конце пути на белом коне в "Красный дом".



Я думаю, что Наталья Петровна умная женщина. И поэтому должна осознавать, что шансов у нее выиграть президентские выборы нет абсолютно никаких. Во-первых, да простят меня представительницы слабого пола, потому что она — женщина. А женщину, судя по данным всех социологических опросов, президентом у нас не изберут — будь ты хоть Машеровой, хоть Брежневой, хоть Маргарет Тэтчер. Во-вторых, Наталью Машерову не изберут президентом потому, что главный пункт ее избирательной программы по сути (и с этим она ничего поделать уже не сможет) это эксплуатация имени отца — Петра Мироновича Машерова, а значит культивация у избирателей ностальгии ко всему советскому. Но, простите, на этой теме вот уже семь лет сидит сам Александр Григорьевич Лукашенко и слазить с нее, похоже, не собирается. Так на чьих ностальгических чувствах собирается играть Наталья Машерова? Нью-пионеров, бойскаутов или, может быть, поклонников группы "Руки вверх!"? Так им на эпоху дорогого Леонида Ильича, извините, начхать с высокой колокольни. Им подавай что-нибудь новенькое. И, скорее, с западным отливом, а не с просроченным восточным.

Понимает ли эти реалии Наталья Машерова? Не сомневаюсь, что понимает. Тогда почему продолжает играть по предписанным сверху правилам? Что ею движет? Финансовый интерес? Искреннее желание помочь лучшему другу с К. Маркса, 38? Что?

Не знаю, сколько протянет на политической кухне "Единство", но боюсь, что белый конь Натальи Машеровой, на котором она якобы планирует въехать на спецтерриторию "Дрозды" в сентябре этого года, окажется в конце концов обыкновенной троянской лошадкой. А зачем нам еще одна троянская лошадка? На этом поле у нас уже полным-полно пасется коней мужского пола. Троянских.

НАВІНЫ

Остарбайтэры, тэрмінова пішыце заявы

11 жніўня заканчваецца тэрмін падачы пісьмовых хадайніцтваў на выплату кампенсацый для былых остарбайтэраў, чыя прымусовая праца выкарыстоўвалася ў перыяд нацыянал-сацыялізму.

На атрыманне выплат у памеры да 15 тысяч нямецкіх марак маюць права ўсе былыя вязні прымусовай працы, якія знаходзіліся ў зняволенні ў адным з нацыянал-сацыялісцкіх канцлагераў або гета па-за межамі сённяшняй тэрыторыі Аўстрыйскай Рэспублікі. Акрамя таго, выплаты ў памеры да 5 тысяч нямецкіх марак прадастаўляюцца асобам, якія былі дэпартаваны на тэрыторыю Германскай імперыі ў межах 1937 года або на акупіраваную трэцім рэйхам тэрыторыю, дзе яны прыцягваліся да прымусовых работ на прамысловых прадпрыемствах або ў дзяржаўным сектары. Гэтыя правілы распаўсюджваюцца і на асоб, якія ў той час былі непаўналетнімі.

Закон аб заснаванні нямецкага фонду прадугледжвае таксама кампенсацыйныя выплаты за іншы ўрон, прычынены асобе ў сувязі з нацыянал-сацыялісцкім самавольствам, у прыватнасці, у выпадках правядзення медыцынскіх вопытаў або сур'ёзнага парушэння здароўя дзіцяці, якое ўтрымлівалася ў прытулку для дзяцей остарбайтэраў. Закон ФРГ таксама змяшчае палажэнні аб прадастаўленні выплат асобам, якія з-за нацысцкіх пераследаў з удзелам нямецкіх прадпрыемстваў панеслі маёмасны ўрон. Прычым кампенсацыі не прадугледжваюцца за ўрон, прычынены вайной, а таксама за знаходжанне ў ваенным палоне.

Усе асобы, якія жадаюць атрымаць выплаты, павінны да 11 жніўня накіраваць заявы адвольнай формы ў беларускі рэспубліканскі фонд "Узаемаразуменне і прымірэнне" (220013, Мінск, Якуба Коласа, 39а, тэлефон 232-70-96, факс 232-11-33).

Марат ГАРАВЫ.

Хуткая дапамога ў перарэгістрацыі

Мінскі сталічны Саюз прадпрымальнікаў, Беларуская асацыяцыя юрысконсультаў і Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Альтэрнатыва XXI" з 1 чэрвеня праводзяць акцыю "Хуткая дапамога ў перарэгістрацыі" для прадпрымальнікаў, якія не паспелі прайсці гэтую працэдуру ў адпаведнасці з Дэкрэтам прэзідэнта № 22. "Хуткая дапамога" будзе працаваць разам з "гарачай лініяй", арганізаванай раней; выклікаць яе можна па тэлефонах: 230-34-02, 277-73-77.

Каменціруючы ў інтэрв'ю БелаПАН неабходнасць новай акцыі экстраннай дапамогі прадпрымальнікам, намеснік старшыні РГА "Альтэрнатыва XXI" Сяргей Балыкін нагадаў, што тэрмін перарэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання (гэта значыць атрымання новага пасведчання) завяршаецца 1 ліпеня 2001 года, а паколькі на афармленне дакументаў мясцовым органам улады заканадаўча адводзіцца адзін месяц, тэрмін падачы дакументаў у выканкам заканчваецца практычна сёння.

Ірына САЗАНОВІЧ.

Фільм Міхаіла Пташука "У жніўні 44-га..." атрымаў "Гран-пры"

Стужка беларускага рэжысёра Міхаіла Пташука "У жніўні 44-га...", знятая па аповесці Уладзіміра Багамолава, атрымала "Гран-пры" ў намінацыі мастацкіх фільмаў на X Міжнародным кінафестывалі славянскіх і праваслаўных народаў "Золотой витязь".

Фестываль, які праходзіў у Тамбове пад дэвізам "За маральныя хрысціянскія ідэалы. За ўзвышэнне душы чалавека", завяршыўся 3 чэрвеня.

Вынікі фестывалю адпавядалі прагнозам. Фільм Віталя Мельнікава (Расія) "Месяцам быў поўны сад" удастоены "Залатога віцязя". Карціна "Ліст у Амерыку" Ігліка Трыфанава (Балгарыя) была адзначана "Сярэбраным віцязем", фільм Прэдрага Веліновіча (Сербія) "Цені ўспамінаў" атрымаў "Бронзавага віцязя". Спецыяльным прызам Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі "За вернасць маральным ідэалам" адзначана работа акцёра Аляксея Пятрэнкі.

Алег САКАЛОЎ, БелаПАН.

ТЕМА ДНЯ

Подумаем вместе!

Официальное начало избирательной кампании не за горами. Чем ближе этот день, тем важнее достижение единства всех здоровых сил белорусского общества как по стратегическим, так и по тактическим аспектам президентских выборов. Самое время, фигурально выражаясь, сверить часы.

Юрий ХОДЫКО, профессор

Прежде всего необходимо констатировать общее согласие всех мыслимых и немыслимых кандидатов в отношении неизбежности смены президента. В этом проявляется всемирно-историческое одиночество диктаторов. Кроме себя Александру Григорьевичу нечего и некого предложить Беларуси.

Однако устранить диктатора еще не означает устранить созданный им режим. В этом противоречии и содержится первый критерий оценки и отбора демократических кандидатов на первый государственный пост. Прелестей диктатуры Беларусь вкусила достаточно. Поэтому общественной поддержки заслуживает лишь тот кандидат, кто готов вернуть страну в правовое поле. С независимыми ветвями власти — исполнительной, законодательной и судебной. Иными словами, тот, кто готов осуществить конституционную реформу, используя "царские полномочия", которые дает президенту сегодняшняя Конституция.

Если претендент не заявляет о такой готовности, то поддерживать его в избирательной кампании нельзя. Ибо это будет второй Лукашенко, какую бы фамилию он ни носил сегодня. Правда, и успех такого "квази-Лукашенко" в борьбе с автором и творцом диктаторского режима маловероятен. Если только А.Г. в кампании запугивания своей "вертикали" не перегнет палку. И не создаст ситуацию 1994 года, когда фаворит избирательной кампании был покинут не только широкими слоями электората, но и своим окружением.

Безусловно, в Беларуси есть силы, заинтересованные в повторении ситуации 1994 года. Тогда С.Шушкевич и З.Позняк, не сумев договориться, раскололи демократический электорат и привели к власти А.Лукашенко, лишив выбора во втором туре здравомыслящую часть общества. Есть люди, которые хотят диктатуры с "человеческим лицом". Они думают, что развал экономики, международная изоляция — это следствие личных качеств А.Г., а не режима единоличной власти. Они будут стремиться к тому, чтобы демократические лидеры повторили ошибку 1994 года. И будут для этого разжигать личные амбиции, распускать слухи и дискредитировать каждого демократического кандидата и всех вместе.

Единственный способ противостоять этой подлой тактике — это иметь одного демократического кандидата.

Кажется, с этим согласны все. Кажется, все понимают, что два, а тем более пять демократических кандидатов, — это не только победа А.Лукашенко. Это его триумф. Он победит разрозненные демократические силы и будет признан западными демократиями как законный глава Беларуси. Даже в том случае, если его победа станет результатом фальсификации итогов голосования и грубых нарушений законодательства. Никто не сможет доказать недемократический характер выборов, если в них будет принимать участие несколько демократических кандидатов. Такая ситуация очень выгодна для А.Лукашенко. И невыгодна для Беларуси. Если не хотеть втайне продления сумасбродного правления еще на пять лет.

Вдумчивый читатель может возразить мне: как нам выбрать этого единственного демократического кандидата? Уже сегодня имеем пять известных претендентов. Да еще З.Позняк, С.Гайдукевич. Да еще Л.Синицын и Н.Машерова. Важный вопрос. Вопрос политической тактики и политической культуры.

Скажем сразу, что демократическим кандидатом может считаться только тот, кто поддерживается объединенными демократическими силами. То есть партиями и организациями, которые своими действиями, своим противостоянием с репрессивным диктаторским режимом завоевали право называться демократическими. С этой точки зрения ни Л.Синицын, ни С.Гайдукевич, ни Н.Машерова, ни С.Калякин не могут считаться демократическими кандидатами даже в случае их участия в избирательной кампании, ибо ничем своего демократизма не засвидетельствовали. З.Позняк сам выступает против объединения демократических сил и поддержан ими быть не может. Нескоординированное, несогласованное его участие в избирательной кампании 2001 года будет хуже, чем ошибка 1994 года.



Все это — вопросы политической культуры. Не могут называться демократическими партии, которые в условиях борьбы с диктатурой вольно или невольно выступают на стороне этой диктатуры.

Итак, реально мы имеем четырех претендентов на важное и ответственное звание единого демократического кандидата на предстоящих президентских выборах. Каждый из них имеет заслуги перед Беларусью и демократией. Каждый из них в состоянии победить А.Лукашенко. Но не все вместе. В этом парадокс сложившейся ситуации. Кажется, прозвучи сейчас призыв к В.Гончарику, С.Домашу, П.Козловскому и М.Чигирю пожертвовать жизнью во имя Беларуси или отказаться от президентских амбиций, то каждый из них скорее выберет первое, чем второе.

Про эту клинчевую, тупиковую ситуацию говорит опыт многомесячных переговоров между претендентами, организованных Координационной Радой демократических сил. КРДС проявила максимум терпения, толерантности и обходительности, предоставляя самим претендентам возможность образовать команду, а не устраивать толкучку, пытаясь одновременно пролезть в одни двери. Поэтому приближается момент, когда будет вынуждена сама сделать выбор.

КРДС — единственный реальный блок демократических партий и неправительственных организаций, способный без денег привлечь к избирательной кампании десятки тысяч активистов. Слухи о том, что КРДС перестала существовать или сильно ослабла в результате выхода из ее состава Статкевича с его сторонниками или Партии труда А.Бухвостова сильно преувеличены. Конечно, довольно очевидно стремление на базе профактива создать "левый центр" — от С.Калякина до В.Гончарика. Но левоцентристская позиция в пространстве политической идеологии уже занята А.Лукашенко. Какие перемены может обещать новый "левый центр" по сравнению со старым?

Без левоцентристских партий КРДС действительно превратится в правоцентристский блок. Это и хорошо и плохо. Хорошо потому, что программа того кандидата, который будет опираться на поддержку КРДС, станет более ясной, вменяемой и отличной от программы А.Лукашенко. Но плохо потому, что консолидация двух центров противостояния действующему режиму как раз очень выгодна А.Лукашенко. Ибо это повтор ситуации 1994 года. И сам диктатор, не имея поддержки большинства общества, легко выигрывает такие выборы. Естественно, наличие большего числа кандидатов только облегчает задачу ППРБ.

В ситуации, когда демократия борется с диктатурой, демократические силы не могут позволить себе роскошь выдвижения двух (или большего числа) кандидатов. Поэтому и возникает очень важный вопрос: что же делать, чтобы не наступать на известные грабли дважды?

Возникшее недавно движение "За новую Беларусь", которое объединяет большое число известных и авторитетных людей, как будто дает возможность свести пятерку к единице. Конечно, если не будет игнорировать КРДС. И если не опоздает. А такая опасность существует.

В настоящее время борются две точки зрения: выбрать единственного кандидата демократических сил до начала сбора подписей или после процедуры регистрации. Мол, кто-то не сможет набрать необходимые сто тысяч подписей. Кто-то не будет зарегистрирован, и тогда оставшиеся либо самостоятельно, либо под давлением авторитетных людей назовут единственного, который и продолжит борьбу, а все остальные снимут свои кандидатуры. Воистину нет предела фантазиям! Бесполезно просить у сторонников этого варианта избирательной тактики привести хотя бы один пример, когда человек, который выполнил жесткие требования, предъявляемые к кандидатам, был зарегистрирован, а потом снял свою кандидатуру. Их просто нет. Потому что это не только вопрос амбиций, но и вопрос ответственности перед теми, кто поддержал выдвижение и кто дал деньги на избирательную кампанию.

Но этих возражений мало. В наших условиях почти полного государственного контроля над СМИ просто недопустимо самим демократическим силам целый месяц, в течение которого будет осуществляться сбор подписей, сеять неразбериху в головах людей и раздроблять свои силы, агитируя сразу за пятерых кандидатов! Более того, такая тактика позволяет ЦВК полностью контролировать ход избирательной кампании. Она позволяет не только отбраковать наиболее трудных противников для диктатора. Но еще хуже — оставить несколько "демократических" кандидатов для облегчения общей победы А.Лукашенко.

Я не случайно взял слово "демократических" в кавычки. Ибо такие кандидаты не имеют (точнее, не будут иметь) ни малейшего права называться демократическими. Они будут просто пособниками отвратительного диктаторского режима. Они должны знать это уже сегодня. Хватит нам позора 1994 года. Хватит тех потерь, которые понесла Беларусь за прошедшие семь лет.

Таким образом, у нас остается только один вариант. Назвать кандидатуру единственного демократического претендента до начала сбора подписей. С тем чтобы не распылять силы. С тем чтобы не путать избирателей, а сразу агитировать за своего представителя. С тем чтобы лишить ЦВК права играть с претендентами. Единственного демократического кандидата Л.Ермошина не посмеет не зарегистрировать, ибо это будет полный провал для Лукашенко. Такие выборы не признает ни одна демократическая страна в мире. А это значит, диктатор не получит материальной поддержки.

Кто назовет эту долгожданную кандидатуру, не имеет значения. Пусть это будет коолиционное движение "За новую Беларусь". Но в согласии с КРДС. Пусть это будет Конгресс демократических сил. Но в согласии с "НБ". Даже лучше, если это будет Конгресс. В его работе может принять участие и движение "За новую Беларусь". Все 115 человек, подписавших обращение к белорусскому народу. Но очень важно, чтобы назвали эту кандидатуру люди, которые будут ходить по квартирам во время избирательной кампании. И люди, которые потом образуют команду нового президента.

Эти две категории людей нельзя противопоставлять. Такая у нас политическая ситуация, что рядом с тысячами рядовых членов демократических партий живут сотни представителей науки, культуры, чиновничества, без которых не обойдется новая власть. Но которые, как черт ладана, боятся "национализма" и "радикализма" демократических партий. Пришло время выбросить эти страшилки на свалку истории. Нужно слить эти два антидиктаторских течения в единый поток, который и очистит авгиевы конюшни режима в сентябре текущего года.

СЛЫШАЛИ?

Лужковский прокол Александра Лукашенко

В понедельник 4 июня, когда писались эти строки, дата президентских выборов в Беларуси была неизвестна

Да, все знают, что выборы главы белорусского государства должны пройти не позднее 23 сентября 2001 года. Этот воскресный день и является последним днем, когда, в соответствии с законодательством, должны пройти выборы. Но это вовсе не означает, что главное событие не может состояться раньше на неделю, две или даже три. Так называемая Палата представителей второго созыва не спешит (или не в состоянии) выполнить свою, может быть, самую главную функцию — принять постановление о проведении президентских выборов. Послушные воле первого человека государства они ждут сигнала. А почему не спешит Александр Лукашенко — всем понятно. Если один человек точно знает, когда пройдут выборы, а его конкуренты томятся в неведении, то ясно, на чьей стороне преимущество.

Однако до минувшей пятницы было еще одно обстоятельство, которое заставляло Александра Лукашенко "темнить" с объявлением даты выборов. В сентябре в Москве должен был пройти объединительный съезд двух политических движений — "Единство" и "Отечество — вся Россия". Планировалось, что новую силу возглавит Юрий Лужков. А нынешний московский мэр якобы пообещал Александру Лукашенко, что среди документов, принятых на объединительном съезде, будет и обращение к гражданам Беларуси, в котором им посоветуют проголосовать на выборах за Александра Лукашенко. Понятно, что такой документ благоприятно подействовал бы на определенную часть белорусского электората. Однако точная дата проведения съезда не была известна. А потому Лукашенко тоже вынужден был не спешить. Какой прок от этого заявления, если, к примеру, выборы в Беларуси будут назначены на 9 сентября, а московское мероприятие пройдет 30 сентября? Никакого.

Однако в пятницу стало известно, что в Москве решили не спешить и провести запланированное мероприятие, к тому же в видоизмененной форме, только в ноябре. Естественно, в такой ситуации документ в поддержку Александра Лукашенко просто не потребуется.

Ну какой смысл всемогущему московскому мэру покидать свой пост ради призрачной роли партийного лидера? Дело в том, что в Госдуме уже два месяца лежит законопроект об особом статусе Москвы. В этом документе предлагается, учитывая особую важность столицы, не избирать больше мэра, а назначать председателем горисполкома одного из вице-премьеров правительства России. Поговаривают, что Владимир Путин, у которого весьма сложные отношения с Юрием Лужковым, хотел видеть хозяином Москвы Сергея Шойгу. А Юрию Лужкову предлагается в виде компенсации пост партийного лидера. Артачиться в такой ситуации нынешний мэр не может потому, что, как утверждают в московском политическом бомонде, на его и его вторую жену Елену Батурину в любой момент можно завести очень серьезное уголовное дело. Вот, скорее всего, почему мэру приходится соглашаться с такой комбинацией.

Владимир ГЛОД.

ЭХО СЕНСАЦИИ

А был ли мальчик?

Вот уже несколько дней козиятки, зимовские, чайки и им подобные с пеной у рта пытаются убедить доверчивых обывателей в том, что некий взрыв на территории Российского посольства — дело рук оппозиции, которая, видите ли, вбивает клин в отношения между нашей страной и Россией. Те, кто открыто выступает против прогнившего лукашенковского режима, выставляются как враги народа, рвущиеся к власти ради собственных выгод.

Умные люди понимают: те же козиятки, зимовские, чайки и им подобные просто-напросто выполняют заказ "Красного дома". Не удержится у власти Лукашенко — погонят от корыта и их. А что касается того, что оппозиция рвется к власти, то комментарий тут следующий. Власть, которая довела народ до нищеты, власть, которая больше болбочет, чем работает, власть, которая изолировала Беларусь от цивилизованного мира, не имеет права на дальнейшее существование. Такая власть должна быть заменена другой, более заботящейся о людях. Ради этого оппозиция и идет на выборы. И не нужно вешать людям лапшу на уши. Почему, скажите, Лукашенко честно не признается: "Не получилось у меня, ухожу..." Ведь он обещал это сделать через два года президентства.

Но вернемся к взрыву в Российском посольстве. Так и хочется сказать: "А был ли мальчик?". Заметьте, неделю все лукашенковские СМИ трубят о теракте оппозиции — *и ни одного конкретного снимка, ни одной специальной телекартинки. Как говорят, ни одного вещественного доказательства.*

Ладно, не подпускают к посольству России в Беларуси журналистов независимых СМИ. Но могли бы запечатлеть на пленку все, что там произошло (хотя бы воронку показали), лукашенковские телевизионщики. Да и для московских каналов это, видимо, интересно. Так нет же — ни одного кадра. Как и ни одного слова со стороны того же посла, других сотрудников представительства.

Вот и думай после этого: а был ли вообще взрыв? Не понадобился ли он лукашенковским пиарщикам для того, чтобы таким вот грязным способом повоздействовать на позицию официальной Москвы для получения публичной поддержки Александра Григорьевича на президентских выборах. Мол, Лукашенко — за объединение с Россией, а оппозиционеры взрывают посольство...

Что ж, на большее лукашенковские ребята, видимо, не способны. Не думаю, что этого не понимают в Кремле. Просто у Москвы свои интересы в Беларуси. И им не важно, кто продает белорусов, важно, чтобы это было на руку России.

Виталий КУЗНЕЦОВ.

ЛЮСТЭРКА

На інтэрв'ю з прэзідэнтам — у кароткай спадніцы

Ганна СОУСЬ

У нядзельным выпуску "Рэзананса" дэманстравалася інтэрв'ю карэспандэнткі АТН з прэзідэнтам Украіны Леанідам Кучмам. Не ведаю, як іншым, але мне вельмі перашкаджаў успрыманню сутнасці размовы выгляд журналісткі. Вельмі кароткая спадніца, чорныя панчохі, высокія боты ярка-чырвонага колеру. Да таго ж крыху расстаўленыя ногі. Уяўляю, як адчуваў сябе спадар Кучма падчас гутаркі. Бо, магчыма, мужчынскае адчуванне крыху перашкаджала яму засяроджавацца.

Але ж не магу сцвярджаць, гэта толькі маё ўласнае меркаванне. Амаль ва ўсіх сучасных падручніках па журналістыцы шмат увагі надаецца пытанням выгляду карэспандэнтаў, асабліва, што датычыцца тэлевізійнай працы. Па-першае, вопратка павінна быць нейтральнай, каб не адцягваць увагу суразмоўцы і гледачоў. Па-другое, ёсць элементарны дзелавы стыль, які выключае ярка-чырвоную памаду, кароткія спадніцы, дэкаратыўную касметыку, занадта сексуальнае адзенне, бо гэта падчас сур'ёзных размоваў ды спраў проста неэтычна. Зразумела, што многія беларускія дзяўчаты проста не ведаюць гэтага. Паводле іх меркаванняў, чым ярчэй, тым прыгажэй. І гэта мае рацыю, калі размова ідзе пра дыскатэку альбо вячэрні шпацыр па праспекце. Але ж не ў тэлевізійнай праграме, і тым больш не ў інтэрв'ю з прэзідэнтам.

Мяне часта цікавіла пытанне: няўжо на цяперашнім Беларускім тэлебачанні няма спецыялістаў, якія б сачылі за выглядам карэспандэнтаў? Бо, безумоўна, не кожны з іх мае густ і ведае, калі і што апрануць на сябе. І менавіта тады патрэбны парады спецыялістаў у справе журналісцкага іміджу. А гэта важная частка тэлевізійнага працэсу, прыкмета прафесійнага тэлебачання.

Я добра памятаю, з якім густам заўсёды апраналіся Зінаіда Бандарэнка ды іншыя. Я не ведаю, ці гэта былі добрыя парады тэлевізійных іміджмейкераў таго часу, альбо проста яны мелі добры густ. І гэта не так істотна, бо іхні выгляд быў інтэлігентным і натуральным, як і мусіць быць на прафесійным тэлебачанні.

Што да цяперашніх прадстаўніц АТН, то выгляд многіх з іх выклікае здзіўленне і заклапочанасць. Яркая касметыка, ненатуральна пафарбаваныя валасы, безліч "плацінавах" бландзінак, кароткія спадніцы. Хто калісьці ўзгадае ногі, напрыклад, Святланы Сарокінай альбо Арыны Шарапавай? Але ж гледачы добра памятаюць іхнія твары, тое, як яны вялі гутарку, спрачаліся альбо нешта каменціравалі. Прычым гэтыя ды іншыя прафесійныя журналісткі былі прыгожа апрануты, дарага і з густам.

Цікава, а які ўспамін застанецца ў Леаніда Кучмы пасля інтэрв'ю з карэспандэнтам Беларускага тэлебачання?

Дипкурьер

Сергей Мартынов и Валентин Величко уедут в Брюссель и Киев

Похоже, "Народная воля" в очередной раз не ошиблась в своих прогнозах. Еще в конце зимы мы писали о возможных перестановках в руководстве Министерства иностранных дел Беларуси. Тогда речь шла о том, что первые заместители министра Сергей Мартынов и Валентин Величко отправятся послами, соответственно, в Брюссель и в Киев, а заместитель министра, генеральный секретарь МИДа Александр Петров — в Софию.

Александр Петров уже работает Чрезвычайным и Полномочным послом Беларуси в Болгарии. А в первой декаде июня должны быть подписаны соответствующие документы на Сергея Мартынова и Валентина Величко. Впрочем, после того как Российская Федерация назначила своим послом в Украине Виктора Черномырдина, в Минске начали поговаривать, что для равновесия неплохо было бы направить в Киев Вячеслава Кебича или, по меньшей мере, Михаила Мясниковича. Мол, у Виктора Степановича Черномырдина и Валентина Владимировича Величко уж слишком разные весовые категории.

Однако, как метко заметил один из моих коллег, у Черномырдина и Величко есть одно общее свойство — оба настолько косноязычно высказывают свои мысли, что, как в старом анекдоте, хочется спросить: в каком хедере их учили русскому языку?

О том, кто придет на смену Сергею Мартынову и Валентину Величко, пока, видимо, говорить рано. Однако в кулуарах уже пошел слух, что кабинет Сергея Мартынова займет нынешний посол Беларуси в Турции Николай Лепешко.

Владимир КОТ.

Народная Воля
5 ЧЭРВЕНЯ 2001 г.

НАВІНЫ

Далі грошы на абарону прыроды

Дацкае агенцтва па ахове навакольнага асяроддзя (DEPA) прадаставіць Беларусі ў 2001 годзе грант у памеры 2,5 мільёна дацкіх крон (каля 285 тысяч долараў ЗША) для рэалізацыі Орхускай канвенцыі.

Орхуская канвенцыя аб доступе да інфармацыі, удзелу грамадства ў працэсе прыняцця рашэнняў і доступе да правасуддзя па пытаннях, якія датычацца навакольнага асяроддзя, была прынята ў канцы чэрвеня 1998 года на канферэнцыі міністраў па ахове навакольнага асяроддзя Еўропы ў дацкім горадзе Орхус. Беларусь падпісала гэты дакумент у снежні 1998 года.

Марат ГАРАВЫ.

Не ўмеюць раскручваць бомбы

1 чэрвеня Беларускі дзяржаўны канцэрн парашковай металургіі вымушаны быў прыпыніць працу цэнтра утылізацыі авіябомб, нядаўна ўведзенага ў эксплуатацыю і размешчанага ў мястэчку Прудок Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці.

Пры праверцы аб'екта Камітэтам па інспекцыі працы пры Міністэрстве працы было ўстаноўлена, што разукамплектаванне авіябомбы робіцца тут у рэжыме, не прадугледжаным праектным рашэннем. Напрыклад, адна з вельмі небяспечных аперацый — вывінчванне запальнага стакана — выконваецца не з пульта дыстанцыйнага кіравання, а ўручную. Для адпаведнасці цэнтра утылізацыі патрабаванням Закона Рэспублікі Беларусь "Аб прамысловай бяспецы небяспечных вытворчых аб'ектаў" спатрэбіцца некаторы час.

У нармальным рэжыме працы утылізацыя ўсяго сховішча гэтых боепрыпасаў на Віцебшчыне зойме каля 20 гадоў.

Леанід СІМАНАЎ.

Раджаюць віч-інфіцыраваныя маці

Сёлета ў Брэсцкай вобласці ад ВІЧ-інфіцыраваных маці нарадзіліся трое дзяцей. Адно немаўля нарадзілася з наркатычнай залежнасцю.

Па-ранейшаму больш за ўсё інфіцыраваных у Пінску — 92, у Баранавічах — 28, у Брэсце — 19. Асноўным спосабам перадачы інфекцыі застаецца перадача праз шпрыцы разам з наркотыкамі. З 2000 года мае месца рост перадачы інфекцыі палавым шляхам.

Забаранілі курыць

Драгічынскі райвыканкам прыняў рашэнне аб забароне курэння ва ўсіх службовых і іншых памяшканнях устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый і калгасаў.

Барацьба з курэннем у раёне вядзецца даволі актыўна. У цэнтры Драгічына з'явілася сценгазета "Прививка", дзе крытыкуюцца курцы і арганізацыі, якія не выконваюць рашэнне выканкама. Па мясцовым тэлебачанні транслiруюцца ролікі, якія павінны выклікаць у насельніцтва агіду да тытуню. Спецыялісты раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі правяраюць прадпрыемствы і арганізацыі, праводзяць гутаркі з кіраўнікамі.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

"Віцязь" скарачае работнікаў

На трохдзённы працоўны тыдзень пераведзена рэспубліканскае унітарнае вытворчае прадпрыемства "Віцязь".

У сувязі з пагаршэннем яго эканамічнага становішча тут чакаецца масавае скарачэнне персаналу — ад адной трэці да паловы, гэта значыць ад 2 да 3 тысяч чалавек. Пад скарачэнне трапляюць нават тыя, хто многія гады складаў кадравы касцяк "Віцязя". Іх спадзяванні на чарговую субсідыю не апраўдаліся. Субсідыя атрымана, а звальненні ўсё роўна будуць.

Гавораць і аб пераводзе "Віцязя" на так званую "адвёрткавую" тэхналогію, пры якой для выпуску, напрыклад, лічбавага тэлевізара "Элегант" з кінескопам фірмы "Філіпс" дастаткова некалькіх соцень работнікаў. Непатрэбнымі будуць многія інжынеры, тэхнікі, канструктары, дызайнеры.

Леанід СІМАНАЎ.

Сацыяльнае страхаванне ў Гомелі

1 чэрвеня на Беларускім металургічным заводзе ў Жлобіне былі ўручаны першыя пасведчанні дзяржаўнага сацыяльнага страхавання.

Такім чынам, Гомельская вобласць стала першай у краіне, дзе рэалізаваны на практыцы прынятыя ў 1999 годзе Закон "Аб індывідуальным уліку ў сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання".

Як вядома, персаніфіцыраваны ўлік дазваляе больш дакладна весці ўлік заробку і ўзносаў у фонд сацыяльнага страхавання, што аблягчае, у прыватнасці, налічэнне пенсій па выхадзе чалавека на заслужаны адпачынак.

Ірына ШАНЦАВА.

Экалагічная аперацыя "Чыстае паветра"

1 чэрвеня ў Беларусі пачалася экалагічная аперацыя "Чыстае паветра".

Асноўныя намаганні ўдзельнікаў акцыі, праводзімай Мінпрыроды і Дзяржаўтаінспекцыяй Міністэрства ўнутраных спраў, будуць скіраваны на праверку экалагічнай дзейнасці аўтапрадпрыемстваў, аўтарамонтных заводаў і станцый тэхнічнага абслугоўвання, а таксама транспартных сродкаў ва ўмовах дарожнага руху.

Экалагічнае заканадаўства забараняе эксплуатацыю аўтамабіляў, у якіх аб'ём шкодных выкідаў перавышае ўстаноўленыя нарматывы. Так, калі змесціва вокісу вугляроду ў адпрацаваных газах аўтамабіля перавышае 1,5 працэнта, з вадзіцеля бярэцца штраф у памеры ад 0,5 да 3 мінімальных зарплат. Вымярэнне таксічнасці выкідаў праводзіцца на прагрэтым рухавіку праз 20 секунд пасля ўстанаўлення максімальнай частаты вярчэння вала матора. Прычым кантроль павінен ажыццяўляцца апламбіраваным газааналізатарам, на якім маюцца звесткі аб тэрміне прыдатнасці прыбора.

Марат ГАРАВЫ.

РЭГІЁН

Нафтавая інтэграцыя

Крычаўскі раён з'яўляецца рэкардсменам па несанкцыянаваных урэзках у расійскі нафтаправод і крадзяжах з яго нафтапрадуктаў.

Праз тэрыторыю Крычаўскага раёна пралягае магістральны трубаправод "Унеча (РФ)—Вентспілс", па якім здзяйсняюцца бесперапынныя пастаўкі ў латвійскі порт расійскага дызельнага паліва. За чатыры з паловай месяцы невядомыя зламыснікі чатыры разы ўразаліся ў трубу і на працягу розных адрэзкаў часу беспакарана адкачвалі салярку. Прычым зладзеі валодалі спецыяльнай тэхналогіяй зварачных работ, бо нафтаправод знаходзіцца пад пастаянным ціскам у 40 атмасфер.

І вось зусім нядаўна была зафіксавана пятая спроба арганізацыі буйнамаштабных крадзяжоў нафтапрадуктаў. Аднак на гэты раз злачынцы былі затрыманы. Імі аказаліся двое жыхароў Крычава, якія на мікрааўтобусе спрабавалі вывезці 1300 літраў дызельнага паліва.

На падставе атрыманых матэрыялаў у адносінах да затрыманых узбуджана крымінальная справа.

Не давяраюць?

Практычна 12 гадоў Крычаўскае грамадскае аб'яднанне "Дзецям Чарнобылю" мае разнастайныя стасункі з нямецкім дабрачынным камітэтам "Дапамога дзецям Чарнобылю". За час супрацоўніцтва каля 1000 крычаўскіх дзяцей адпачылі ў Германіі, а пра памеры гуманітарнай дапамогі няёмка гаварыць — гэтыя памеры проста велізарныя.

У сярэдзіне мая немцы зноў наведалі Крычаў. На гэты раз яны прывезлі прыкладна 100 тысяч марак. Сродкі вырашана накіраваць на патрэбы тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання (ТМА). Прыкметным у гэтай акцыі можна назваць тое, што грошы ўвогуле не былі аддадзены беларускім партнёрам. Немцы прапанавалі наступную схему ажыццяўлення дапамогі: ТМА павінна выбраць для сваіх патрэб неабходнае медыцынскае абсталяванне на вышэйазначаную суму, а прадстаўнік камітэта "Дапамога дзецям Чарнобылю" аплаціць яе.

Што ж, прымаючы рашэнне аб падобнай форме супрацоўніцтва, немцы, верагодна, улічылі спецыфічныя ўмовы працы ў Беларусі.

Барацьба за выжыванне

На сённяшні дзень у Чэрыкаўскім раёне налічваецца 154 разумова адсталых дзіцяці, 135 з іх маюць патрэбу ў спецыяльным навучанні. Нягледзячы на гэта, у Чэрыкаве адкрыты толькі адзін клас для падобнага роду вучняў, разлічаны ён толькі на 17 чалавек. Усе астатнія хворыя хлопчыкі і дзяўчынкі наведваюць самыя звычайныя школы.

Ведаючы адносіны постсавецкага грамадства і сярэдніх школ як яго часткі да разумова непаўнавартасных, застаецца толькі пашкадаваць маленькіх чэрыкаўцаў.

Усход вымірае

Дэмаграфічная сітуацыя ў Мсціслаўскім раёне даўно ўжо выклікае занепакоенасць. Літаральна з кожным месяцам тут усё менш нараджаецца дзяцей і ўсё больш мясцовых жыхароў развітваецца з жыццём. Балазе для гэтага маюцца ўсе прадпасылкі.

За першыя 4 месяцы 2001 года на Мсціслаўшчыне памерлі 203 чалавекі. За гэты ж перыяд нарадзілася толькі 93 дзіцяці. Цікава, што 28 наваспечаных матуль на момант нараджэння не мелі мужоў — з'яўляліся маці-адзіночкамі. Яшчэ 3 з іх — непаўналетнія.

Андрэй КУЗЬМІН,
кіраўнік інфармацыйнай службы "Кантакт-цэнтр".
г.Крычаў.

4. НЕПАДНЯТАЯ ЦАЛІНА,

або Хто будзе адраджаць нашу зямлю?

Васіль ГРОДНІКАЎ

Гульня без правілаў

Любую кардынальную рэформу на першым часе трэба забяспечыць матэрыяльна. І не толькі крэдытамі, але і дзяржаўнай дапамогай па стварэнні для прыватных гаспадарнікаў матэрыяльна-тэхнічнай базы. А гэта значыць, што найперш трэба рэфармаваць (або пашырыць) магчымасці тэхніка-вытворчых прадпрыемстваў для таго, каб забяспечыць патрэбы не толькі буйнамаштабных гаспадарак (калгасы і саўгасы), але і дробных (узбуйненыя прысядзібныя і фермерскія гаспадаркі) неабходнай тэхнікай, прыстасаваннямі, запчасткамі. Прычым таннай, магчыма, з дзяржаўнай датацыяй прамысловым прадпрыемствам, тэхнікай. Трэба стварыць сетку кансультацыйных пунктаў і сервісу, карыстацца якімі можна будзе спачатку бясплатна, потым — па ільготным тарыфе, а пры наладжанай у прыватных гаспадарках справе — па рынкавым кошце.

Вядома ж, што ўсе гэтыя спрыяльныя ўмовы павінны быць юрыдычна падмацаваны законамі, пастановамі ўрада і г.д. Асабліва жорстка трэба выкарчоўваць прычыны, якія ўзбуджаюць "пьяных и убогих", гультаёў, зайздроснікаў і іх бальшавіцкую смагу да "чырвоных пеўняў", ахвоту адабраць і падзяліць, напаскудзіць, знявечыць, зняважыць... Без адпаведнай жорсткасці дзяржавы тут не абысціся. Хвароба надзвычай запушчаная, а таму дзе — пернікам, дзе — скальпелем...

Неабходнасць і надзённасць канкрэтных дзеянняў і праяўлення адпаведнай палітычнай волі кіраўніцтва дзяржавы сцвярджаюць і сацыялагічныя даследаванні. Нягледзячы на мэтанакіраваную дзейнасць сённяшняга рэжыму на недапушчэнне прыватнай уласнасці на зямлю, уціскванне фермерскіх гаспадарак, адмоўнае стаўленне да прыватнай уласнасці з выкарыстаннем наёмнай працы і заахвочванне прыязных адносін да архаічнай (анахранічнай) калгасна-саўгаснай сістэмы, факты і лічбы апытанняў насельніцтва схіляюцца на бок новай фармацыі вёскі і карэнныя рэформы сельскай гаспадаркі. Хто не любіць лічбаў, прашу вас трошкі пацярпець: самі разумееце, такую выснову я павінен абгрунтаваць. Дык вось: за прыватную ўласнасць на зямлю сёння выступае 69 працэнтаў апытаных. Супраць — 13. (Далей тых, хто супраць, я буду пазначаць у дужках.) Да фермерскіх гаспадарак прыхільна адносяцца 72 (10) працэнтаў. Рэспандэнты не бачаць нічога кепскага ў тым, што прыватны сектар будзе выкарыстоўваць наёмных работнікаў — 43 (31) працэнты. А вось да калгасна-саўгаснай сістэмы, як і даводзіў я вам раней, прыхільна адносяцца 43 (28) працэнты.

Калі прыняць да ўвагі мае ранейшыя тлумачэнні, чаму сяляне нават сёння, калі калектыўныя гаспадаркі ляжаць на баку і не падаюць ніякой надзеі на выздараўленне, па-ранейшаму любяць калгасы і саўгасы, то можна зрабіць бясспрэчны вывад: шлях назад, да прыватнай уласнасці, можа стаць сапраўды прагрэсіўным крокам наперад. Толькі ці пагодзяцца з гэтым тыя "бычкі", "легіёны чыноўнікаў, ілжэнавукоўцаў, для якіх зямля — гэта ўлада, бяздоннае існаванне", бо "аддаць зямлю сапраўдным гаспадарам яе — значыць наблізіць свой палітычных крах"? *(Цытата з А.Лукашэнкі.)* Я цалкам пагаджаюся з колішнім дырэктарам саўгаса, што чынавенская раць "учэпіцца за яе (зямлю. — **В.Г.**), прыкрываючыся інтарэсамі людзей і клопатамі пра іх".

Кантрацэптывы для... вёскі

Але як бы там ні было, а парасткі новага, прагрэсіўнага прабіваюцца праз асфальт бюракратычных напластаванняў, перашкод, рэтраградства і ідэалагічныя "ізмы". Хачу расказаць вам пра адну са шматлікіх прыватных гаспадарак, што ў вёсцы Юзэфава пад Мінскам. Гэта фермерская гаспадарка Ярэны Парфіяновіч. 94 гектары зямлі, сажалка з рыбай. Гаспадыня пяць разоў на год вырошчвае чыстую гародніну для жыхароў сталіцы. Сфінаферма ёсць. Веснавую сяўбу правяла з насеннем, палівам, запчасткамі, угнаеннямі. І ўсё гэта без крэдытаў і датацый дзяржавы. Ні на кога не спадзяецца. Сама. Вось што яна расказвае:

— Не трэба фермерам ствараць нейкія асаблівыя ўмовы. Ім хоць бы роўныя ўмовы гаспадарання з калгасамі і саўгасамі. Каб давалі фермерам магчымасць браць у дзяржавы неабходныя крэдыты, зямлю, каб давалі не такую, як даюць — адна няўдобіца, — а такую, як у калгасе. Дазволілі б купляць тэхніку па лізінгу, насенне, угнаенні. І каб нас не ставілі ў становішча пасынкаў. Вось я павезла сваю прадукцыю ў Маскоўскі РПК у Мінску, а мне, як кажуць, ад варот — паварот. Паведамілі, што нядаўна была нарада і там загадалі камбінатам прымаць прадукцыю толькі ад калгасаў і саўгасаў. Ад фермераў прадукцыю не браць... Ну, скажыце, ці ёсць галава на плячах у таго, хто аддаў такі загад? Дурнота ды і толькі! Ці заўважылі вы, што сям-там ужо праклёўваецца птушаня класавага падыходу?..

Я ўспамінаю расказ фермера Івана Фёдаравіча Гаўрыленкі з Пастаўскага раёна:

— Вунь бачыце стары кароўнік? Адны сцены. Гіне. Прасіў, каб аддалі мне ці прадалі. Не аднаўлю, то добрая будаўнічая пляцоўка будзе. Не! Не загадана падтрымліваць фермераў. А мы ж, фермеры, як пагарэльцы: што ні ўбачым, тое і трэба...

А ў мяне зноў думкі: няўжо ў нас на месцах столькі начальнікаў-дурняў? Ці, можа, процьма безгаловых салдацікаў, што бяруць пад картуз любы загад ад вярхоўнага начальства? Я мяркую, што ўсё гэта ідзе ад галоўнага каардынатара вырашэння харчовай бяспекі краіны. А вы як думаеце?

І зноў вяртаюся да думкі: колькі ж часу прыйдзецца патраціць наступнаму пакаленню палітыкаў і разумных гаспадароў, каб выправіць тую дурноту, якая сёння шашалем точыць усё наша людское і ўладнае асяроддзе? А колькі прыйдзецца папацець, каб адмяніць старыя і выпрацаваць новыя і талковыя законы, бо дурная помач горш за немач?! А лінію выпраміць, каб па-людску выглядала? А памірыцца са светам, які нас ведае па нашай дурноце, упартасці ды жорсткасці да ўласных людзей? А колькі прыйдзецца прасіць прабачэнняў у суседзяў, якіх у свой час абражалі, на якіх гналі хвалі гневу, хлусу, бязглуздзіцы? Не, не мы. Нашы ўвенчаныя ўладай суайчыннікі. Во злавілі плотку, што не лезе ў глотку!!! Божа, Божа, у якой мы апынуліся лужыне?! У якім брудзе! Праўду людзі кажуць, крывое кола на сябе гразь кідае. Здаецца, і радні багата — усе краіны СНД і краіны-ізгоі, а пабедаць няма з кім...

Што ж будзе заўтра, як вы думаеце? Ды што я пытаюся: на крывой дарозе наперад не відаць...

У час сваіх вандровак па краіне заўважыў: сярод людзей вельмі распаўсюджана пагардлівае стаўленне да паняцця "парабак". Гэта пра тых, хто, бывае, працуе ў фермераў. І мне падумалася: вось менавіта такія пры выпадку могуць пусціць пад страху "чырвонага пеўня", каб усё тое багацце злізаў агонь і развеяў вецер. Каб фермеры сталіся такімі, як усе. Тлее яшчэ з эсэраўскіх часоў рэвалюцыйна-камісарская іскрынка ў людскіх галовах. Знойдзецца гарлапан, які з чырвоным сцягам у руках крыкне: паліць і дзяліць! І зашугае вогненны смерч над фермерскімі пабудовамі і ў падворках больш заможных сялян.

Неяк агідна было думаць пра такое. І слухаць несправядлівае. А калі даводзілася тлумачыць: а калгаснік, якому нярэдка за паўгода і зарплату не выдаюць і пра якую нават сорамна прызнацца таму ж фермерскаму "парабку", хіба ён не сапраўдны парабак? Хіба гэта не эксплуатацыя, калі калгаснік наробіць, скажам, на тысячу рублёў, а яму замест грошай — кукіш пад нос? Грошы ідуць на пакрыццё страт пры ўборцы і захаванні, шмат чаго крадзецца, ідзе на недабор прадукцыі, ад недахопу ўгнаенняў, кепскага насення, адсутнасці хімікатаў, запчастак, тэхнікі і старой тэхналогіі, ад высокага сабекошту работ. І ўспомнілася мне шчырасць адной з кабет, якая "даказвала" перавагу калгаса: "У калгасе добра, ёсць за каго схавацца...". Прызнанне падвыпіўшага Сцяпана з Пастаўскага раёна: "А я ў калгасе больш маю!". І словы майго сваяка з-пад Бабруйска: "Во, каб усе так рабілі, мы б паўсвета прадуктамі завалілі".

Думаецца і пра тое, што ў нас і на прадпрыемствах, і асабліва на вёсцы пад уздзеяннем сацыялістычнага ладу жыцця і пад уплывам сацыялістычнага погляду на жыццё у людзей нешта зрушылася ў галаве: усё пасунулася ў той бок, каб менш працаваць, а больш атрымліваць. Недаплату прызвычаіліся браць натурай: хто ўкрадзе, хто возьме проста так. На рабоце, каб толькі дзень да вечара. Такія не лянуюцца чужога абеду дачакацца. А шмат і такіх: хто бліжэй да міскі, той і чэрпае. Канешне, ад такой трасцы за адзін дзень не пазбавішся, але выпраўляць мазгі такім "працаўнікам" трэба. Калгас у прыватнасці, не здолее з гэтым справіцца, таму што ад калгаса і пайшла гэтая зараза. А вось фермерскія гаспадаркі, на мой погляд, акажуцца добрымі псіхатэрапеўтамі: не дадуць чужымі блінамі сваякоў памінаць! Фермеры з тымі, хто на рукі не чыстыя ды ў каго лужонае горла, разбяруцца хутка. Такім, хто марыць, каб яды — як на дзяды, а работы — як у нядзельку, будуць даваць ад варот — паварот. А злодзеяў і на дух не падпусцяць.

І фермерства, і багатыя ўласныя гаспадаркі ў будучым павінны стаць своеасаблівымі кантрацэптывамі (процізачаткавымі сродкамі) супраць "пьяных и убогих", злодзеяў і гультаёў, а таксама ад гвалту шматлікай арміі мясцовых, раённых і абласных "бычкоў", што пасвяцца сёння на прыгонніцкім полі беларускага селяніна-жабрака.

***

...А ў вяскоўцаў, прыкмеціў я, сёння трывога на сэрцы: усё, здаецца ім, ідзе да таго, што хутка скончыцца кату масленіца. Прыйдзецца, як раней казалі, перажываць перабудову. Калгасы доўга не працягнуць, гэта цяпер і дурню зразумела, ад іх, хочаш не хочаш, а ўсё ж адкажуцца. Вось тады і давядзецца селяніну шкрабаць за вухам: самому ісці ў фермеры ці наймацца да фермера ў "парабкі"? А не, то прыйдзецца класці зубы на паліцу. Але ж сум па "дурніцы", калі было ўлежна, уежна і можна было з каўшом накінуцца на брагу, ды ўсё гэта на "халяву", вярэдзіць шмат у каго душу. Так і хочацца каторым, каб такая "дармаўшчынка" ніколі не канчалася. Страх істоты, селяніна, якую пашкодзіла бальшавіцкая спадчыннасць, сёння паралізуе яго імкненні да стваральнай працы, да рашучых дзеянняў у гэтым напрамку: а раптам нічога не зменіцца і зноў прыйдуць бальшавікі з вінтоўкамі, каб раскулачыць. Ну, як у тым выпадку: пана павесілі, а сяляне тры дні перад ім шапку здымалі ды кланяліся — а раптам адарвецца!

Час змяніўся, а свет — не. Уцякалі ад пана, а патрапілі да войта. І зямлі атрымалі столькі, што толькі пані сесці. Вось так, браток-беларус. Хіцёр Зміцёр, ды Саўка не дурань! Чухай патыліцу, мужычок, ды раскінь мазгамі на цвярозую галаву... Нікуды не дзенешся: прыйдзе такі час, калі трэба будзе дбаць пра людскі свет, а не жыць са свінячым норавам!

А не, то пойдзе на людзей вялікая пошасць: палі зарастуць лесам, душы зачарсцвеюць, сэрца высахне, а хаўтуры святам будуць. Людскі мор стане жаданай надзеяй на ўласнае выратаванне...

Нагадваць пра нас на першым часе будуць спарахнелыя крыжы. А наш час і нас саміх гісторыя пазначыць, як шкодную для нармальнага чалавечага жыцця эпоху з носьбітамі амаральных, атрутных і анамальных з'яў — аніяк не божых стварэнняў. І станем мы залежам гісторыі, яе вечнай цалінай...

в.Мазалі
Маладзечанскага раёна.

Красные безрукавки

О тех, кто убирает улицы

— Не будешь учиться, пойдешь улицу подметать! — в сердцах кричит соседка на дочь, выпускницу школы. — Наденешь красную безрукавку, возьмешь в зубы совок и метлу — и вперед! Ты этого хочешь? К этому стремишься?

Обладатели одинаковых красных безрукавок, как выяснилось, работают в разных организациях: "Ремавтодоре" и "Зеленстрое". Первые подметают проезжую часть улиц и тротуары, вторые — зеленую зону и прилегающие пешеходные дорожки. И зарплаты у них, утверждают, тоже разные. По сравнению с другими, заметим сразу, немаленькие.

Объединяет же их главное: работают на улице круглый год. В теплое время года метут песок, собирают окурки и прочий мусор; в холодное, зимой, например, сгребают снег, долбят лед на остановках... Тяжелый, непрестижный труд. Учитывая наши климатические условия — не женский труд.

Может быть, и впрямь моя соседка права, утверждая, что здесь работают деградировавшие, недалекие люди? А вы попробуйте туда устроиться. Я — пробовала. Не берут. И вовсе не высшее образование тому преграда. Вакансий нет. Во всяком случае, именно такой ответ я получила в обеих достопочтенных организациях Первомайского района столицы.

Работают в них и пенсионеры, и молодежь, люди малограмотные и высокообразованные. Студентов и школьников на подработку не берут. В этом нет необходимости. Проблем с постоянными кадрами не испытывают. Народ к ним валом валит. Произошел отток кадров из ЖЭСов, где практически за равноценный труд платят гораздо меньше (раза в три-четыре). Насколько хорошо платят в "Ремавтодоре", моя собеседница распространяться не стала. Лишь сухо заметила: будем считать, тысяч 80. На самом-то деле, нехотя раскрыла коммерческую тайну, получается значительно больше. Все зависит от рвения, старания и прочего. Коэффициент различных доплат определяет мастер. Тысяч 120 в месяц набегает.

